# ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА: памяць павінна жыць

**Набліжаецца юбілей трагічнай падзеі... 28 ліпеня 2014 года спаўняецца 100 гадоў з пачатку аднаго з самых крывапралітных і маштабных узброеных канфліктаў у гісторыі чалавецтва — Першай сусветнай вайны.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вялікая вайна стала шматнацыянальным горам: у ёй удзельнічалі 38 краін з 59 існуючых на той час незалежных дзяржаў. У выніку перасталі існаваць 4 імперыі: Расійская, Аўстра-Венгерская, Асманская і Германская. Загінула каля 10 мільёнаў вайскоўцаў, яшчэ больш мірных жыхароў.

Так склалася, што мы быццам бы выкраслілі са сваёй памяці гэтыя падзеі, гэтыя лічбы, гэтых людзей... Бо ўсё часцей узгадвалі наступствы самай апошняй вайны — Вялікай Айчыннай. А так быць не павінна. Бо Беларусь была ў эпіцэнтры тых баёў, лінія фронту доўгі час праходзіла на нашай зямлі.

Так думаюць гісторыкі, даследчыкі і проста неабыякавыя да гэтай тэмы людзі, якія сабраліся падчас пасяджэння «круглага стала» газеты «Звязда» і аналітычнага цэнтра EcooM. Узгадалі трагічныя падзеі той вайны, абмяркоўвалі пытанні захавання гістарычнай памяці, адкрылі малавядомыя старонкі гісторыі...

СТАР. 4

